І. А. МАРЗАЛЮК
МДУ імя А.Куляшова

# ПАХАВАЛЬНЫ АБРАД ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА ПА ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫІ ПАЎНОЧНА-УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Важнейшай крыніцай, якая дазваляе скласці больш поўнае ўяўленне аб маштабах хрысціянізацыі насельніцтва Паўночна-Усходняй Беларусі з'яўляюцца пахавальныя помнікі смаленскіх і полацкіх крывічоў ды радзімічаў.

Як вядома, для пахавальнай паганскай абраднасці ўсіх без выключэння славян быў першапачаткова характэрны абрад крэмацыі. Пахавальны абрад славян захаваў традыцыю палёў пахаванняў ранняга жалезнага веку, паглыбленую нівеліруючым уплывам познерымскай правінцыйнай культуры: парэшткі трупаспаленняў, якія здзяйсняліся пераважна на баку, хаваліся на бескурганных могільніках альбо пад невялікімі паўсферычнымі насыпамі ў ямках, радзей – у урнах, практычна без суправаджальнага інвентара. У VI – VII стст. з'яўляецца звычай будаваць надмагільныя насыпы – курганы пры захаванні крэмацыі памерлых. На працягу VIII – IX стст. адбываецца амаль поўнае выцясненне грунтовых магіл курганамі[12, 196; 14, 150].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прычыны пераходу да інгумацыі, якая шырока распаўсюджваецца на славянскіх землях ў пачатку XIст., да сённяшняга дня працягваюць быць прадметам вострай навуковай дыскусіі. Большая частка даследчыкаў даводзіць, што распаўсюджанне хрысціянскіх ідэй абумовіла змену пахавальнага абраду з крэмацыі на інгумацыю[14, 151—152]. Пераход да інгумацыі ў усходніх славян зараз тлумачыцца шматлікімі прычынамі – пачаткам дзяржаваўтварэння і сацыяльнай стратыфікацыяй грамадства, якая ў сваю чаргу магла прывесці да рэцэпцыяў пахавальнай абраднасці па ўзору інгумацыі як у суседзяў намадаў на поўдні, гэтак і капіраванні пахавальных звычаяў скандынаваў, што было абумоўлена этнічным паходжаннем дынастыі Рурыкавічаў, значнай часткі іх дружыны і купецтва. Гэты працэс супаў з пачаткам хрысціянізацыі Кіеўскай Русі напрыканцы X – XI стст[21, 45—53]. Успомнім, для Нестара паганскім пахавальным звычаям з'яўляецца крэмацыя. *Менавіта толькі крэмацыю*, а ніякія іншыя пахавальныя звычаі, ў тым ліку інгумацыю ў кургане, адносіць летапісец да паганскіх [13, 21].

Аднак наўрад ці можна лічыць хрысціянізацыю усіх усходнеславянскіх зямель у XI ст. адбыўшымся фактам. Слоў няма, на масавы пераход да інгумацыі не магла не паўплываць дзейнасць хрысціянскіх месіянераў і інфільтрацыя хрысціянскіх ідэй у асяроддзе вясковага насельніцтва. Аднак думаецца, што ў дадзеным выпадку таксама можна казаць і пра імкненне да капіравання пахавальных звычаяў сацыяльнай верхавіны шэраговымі абшчыннікамі. Тым больш, што адносіць любое курганнае пахаванне па абраду інгумацыі да хрысціянскіх таксама наўрад ці апраўдана. Курганныя інгумацыі ў якіх захоўваюцца ахвярапрынашэнні[10, 17], адсутнічае хрысціянская сімволіка і арыенціроўка нябожчыка, наўрад ці можна адносіць да хрысціянскіх пахаванняў. Будаўніцтва кургана (доміка памерлых), змяшчэнне туды разам з памерлымі розных прадметаў, скарыстанне агня, правядзенне трызнаў – ўсе гэтыя прыкметы безумоўна звязаны з паганскімі пахавальнымі ўяўленнямі, сведчаць аб устойлівасці традыцыі.

Спалучэнне паганскага інвентара і хрысціянскіх сімвалаў у курганных пахаваннях не дазваляе інтэрпрэтаваць такія комплексы адназначна як хрысціянскія. Сумяшчэнне хрысціянскіх і паганскіх абрадаў у межах аднаго пахавання сведчыць аб рэлігійным сінкрэтызме – крыжы, у ранніх курганных комплексах па абраду інгумацыі, як правіла, ўключаліся ў склад караляў у жаночых комплексах[14, 151]. Але нельга і не заўважыць таго факта, што ўжо ў гэты перыяд можна казаць аб пэўных трансфармацыях у ментальнасці носьбітаў паганскіх традыцыяў – найперш гэта тычыцца засваення ідэі інгу-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мацыі і скарыстання крыжа ў якасці абярога, а значыць і прызнання яго сакральнай сілы. Знаходкі крыжоў у магілах з інвентаром, які з'яўляецца не проста прыналежнасцю касцюма, а пахавальнымі дарамі, сведчыць аб сінкрэтызме веравання і нагадвае аб звычаях primo signatio, "непоўнага хрышчэння" і да гэтага падобных з'яваў эпохі пачатковай хрысціянізацыі, калі спалучаліся хрысціянскія і паганскія звычаі[12, 227].

Паспрабуем на канкрэтным археалагічным матэрыяле, атрыманым даследчыкамі ў выніку шматгадовых археалагічных раскопак гарадскіх і вясковых пахавальных помнікаў Паўночна-Усходняй Беларусі X—XIII стст., прасачыць як хутка адбывалася засваенне хрысціянскай эсхаталагічнай канцэпцыі крывіцкім і радзіміцкім насельніцтвам. Першымі рэгіёнамі, дзе у курганных пахаваннях канца X – XI стст. зафіксаваны шматлікія знаходкі крыжоў з выявай Распяцця і крыжоў скандынаўскага тыпу, стаў Полацк і радзіміцкія землі, што сведчыць аб пачатку працэса хрысціянізацыі рэгіёна і першых кроках эвалюцыі паганскай ментальнасці ў накірунку да хрысціянскай[3, 9].

Найбольш глыбокае засваенне хрысціянскага вучэння адбылося на першым этапе распаўсюджвання новай рэлігіі ў гарадскіх і адміністрацыйна-фіскальных цэнтрах. У гарадах Полацкай і Смаленскай зямлі пахавальны абрад даволі хутка, ўжо ў XI – пачатку XII ст. стаў цалкам адпавядаць хрысціянскім канонам – пахаванні ў Полацку, Менску, іншых гарадскіх цэнтрах, пачынаюць здзяйсняцца ў грунтовых могільніках, нябожчыкаў хаваюць ў трунах, у магілах практычна адсутнічае суправаджальны пахавальны інвентар [20, 91—92]. Падобная з'ява была характэрная і для перыферыйных адміністрацыйных цэнтраў Полацкай зямлі. Вельмі важную інфармацыю па гэтаму пытанню дае нам адкрыццё грунтовых могільнікаў XI – XIII стст. на тэрыторыі Віцебскай вобласці – каля вёскі Казлоўцы Звуц'еўскага сельскага савета Міёрскага раёна і вёскі Пашавічы Мяжанскага сельскага савета Браслаўскага раёна. Паказальна, што толькі ў жаночых пахаваннях прасочаны суправаджальны інвентар, ўсе мужчынскія інгумацыі безінвентарныя, ў асобных пахаваннях зафіксаваны рэшткі трун, нябожчыкі былі пахаваныя ў грунтовых ямах, з характэрным для хрысціянскай абраднасці размяшчэннем скрыжаваных рук на жываце. Аб "невясковай" прыналежнасці нябожчыкаў гавораць і знаходкі тыповых для гарадской моды жаночых упрыгожванняў, ў тым ліку і залатых трохпацеркавых скроневых кольцаў. Да перажыткаў паганства можна аднесці толькі здзяйсненне трызны і скарыстанне агня для ачышчэння пляцоўкі побач з пахаваннямі – аб гэтым сведчаць зафіксаваныя рытуальныя ямы авальнай формы і рэшткі вогнішчаў. Ямы запоўнены шэрай зямлёй, перамешанай з вуголлямі. У большасці ям знойдзены



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

косткі жывёл і птушак, фрагменты ляпной і ганчарнай керамікі, перапаленыя металічныя прадметы[18]. Гэтыя звычаі былі надзвычай жывучымі – яшчэ напачатку XXст. звычай "грэць нябожчыкаў" захоўваўся ў асобных рэгіёнах Беларусі, напрыклад на Міншчыне, а здзяйсненне трызны, зазнаўшы пэўныя трансфармацыі дажыло да сённяшніх дзён і ўвасоблена ў звычаях памінальнай вячэры, Радуніцы і восенскіх Дзядах.

Назіранні за зменамі пахавальнай абраднасці ў смаленскіх крывічоў у перыяд пераходу ад паганства да хрысціянства таксама дэманструюць устойлівую залежнасць гэтага працэса ад аддалёнасці вясковых курганных могільнікаў да гарадскіх цэнтраў[20].

Эвалюцыя пахавальнага абрада на вясковых курганных могільніках полацкіх крывічоў нічым прынцыпова не адрозніваецца ад зменаў у пахавальнай абраднасці крывічоў смаленскіх: і ў тых і ў другіх у першай чвэрці XI ст. абрад інгумацыі канчаткова выціснуў трупаспаленне, і ў тых і ў другіх інгумацыі XI ст. захоўваюць прыкметы вогнепаклонства, а ў XII ст. распаўсюджваюцца насыпы з трупапалажэннямі на мацерыку без кастрышчаў і ў той жа час з'яўляюцца пахаванні ў падкурганных ямах, якія ў XIII ст. становяцца пануючымі[15, 162—163; 20, 62—93].

Не менш цікавую інфармацыю мы атрымоўваем і пры аналізе пахавальных комплексаў радзімічаў. Як вядома, для іх пахаванняў Хст. быў характэрны абрад крэмацыі. Археалагічна ён падзяляецца на два віды: пахаванні ў грунтовых ямках якія маюць агульнаславянскі выгляд і знаходзяць паралелі ў розных групах старажытнасцей Усходняй і Цэнтральнай Еўропы другой паловы I тыс. н. э. і спецыфічна радзіміцкія пахаванні-спаленні на спецыяльных панадземных драўляных збудаваннях – "столпах". Рэшткі апошняга віда пахавальных помнікаў радзімічаў зусім нядаўна былі адкрыты беларускім археолагам А. Макушнікавым пры даследаванні могільніка Нісімкавічы I каля Чачэрска. Такі пахавальны абрад заставаўся дамінуючым у зямлі радзімічаў да канца X ст. [11,168—184]. Археолагаў і гісторыкаў даўно цікавіла прычына змены пахавальнай абраднасці радзімічаў, перахода да курганных могільнікаў. А. Макушнікаў лічыць, што для высвятлення гэтага пытання прынцыпова важнай з'яўляецца храналагічная мяжа, калі ў радзімічаў замацоўваецца традыцыя ўзвядзення курганоў – канец X ст. Менавіта ў гэты ж час (984 г.) адбываецца канчатковая ліквідацыя радзіміцкай самастойнасці і іх далучэнне да Кіеўскай Русі. Уваходжанне радзімічаў у Кіеўскую Русь непазбежна вяло да стварэння на месцы новых органаў дзяржаўнай улады і з'ўленню (пасля 988 г.) у Пасожжы хрысціянскіх місіянераў, якія пачалі барацьбу з радзіміцкім паганствам. Таму, ўслед за У. Багамольнікавым, А. Макушнікаў выказаў меркаванне, што асноўнай прычынай пераходу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

радзімічаў да курганных пахаванняў была пагроза іх паганскім помнікам з боку хрысціянскай царквы[4; 11, 185]. Нам здаецца, што нельга адмаўляць уплыва на гэты працэс і новых сацыякультурных узораў у пахавальнай абраднасці, якія сыходзілі з дзяржаватворчых цэнтраў Кіеўскай Русі і былі першапачаткова характэрны толькі для знаці, падобна як і ў Скандынавіі, дзе пераход да багатых пахаванняў у курганах спачатку з'яўляўся характэрнай адзнакай набілетэта. Верагодна, што менавіта традыцыя ўзводзіць вялікія дружынныя курганы, якая адлюстроўвала працэс кансалідацыі правячай страты Кіеўскай Русі, скарыстанне імі адзінага сацыякультурнага ўзору[17, 28—31], магла істотна паўплываць на змену традыцыйнай пахавальнай абраднасці ва ўсім усходнеславянскім арэале. Капіраванне элітарных узораў культуры на масавам узроўні – рэч агульнавядомая. Як паказалі даследаванні Л. У. Дучыц, вялікія курганы сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі нашай краіны, але найбольшая іх канцэнтрацыя характэрна для паўночнага усхода Беларусі і Беларускага Падняпроўя[8, 76—80]. Паказальна, што вялікія насыпы звычайна знаходзяцца пасярод курганных груп, што таксама можа ўскосна сведчыць аб больш высокім сацыяльным статусе пахаванага нябожчыка ў параўнанні з іншымі, важнасці яго магілы для ўсяго калектыву.

Пераход да курганнай інгумацыі ў радзімічаў, як і ў крывічоў, не прывёў адразу да змены паганскіх звычаяў і ўяўленняў. Пэўны час "столп" – дамавіна працягваў існаваць і пад курганным насыпам. Гэту форму абрада змяняе трупаспаленне на мацерыку, пазней яно змяняецца трупапалажэннем на гарызонце размешчаным на кастрышчы, якое саступае месца інгумацыі на мацерыку. Трупапалажэнні пераважаюць ужо ў XIст. У другой палове XII – першай палове XIII стст. пануючай формай пахавальнай абраднасці ў "зямлі радзімічаў" становіцца інгумацыя ў падкурганнай яме[5,24—26; 11,184].

Пахавальная абраднасць у радзімічаў эвалюцыянавала ў тым самым накірунку, што і ў полацка-смаленскіх крывічоў. Найбольш раннія інгумацыі і адмова ад скарыстання агня была характэрна, як і на паўночным усходзе Беларусі, ў першую чаргу для гарадскіх могільнікаў, што безумоўна сведчыць аб залежнасці гэтага працэсу ад больш хуткай хрысціянізацыі насельніцтва гарадоў. Параўнальная характарыстыка, праведзеная У.У. Багамольнікавым гарадскіх і сельскіх могільнікаў паказала, што, акрамя адзначаных у літаратуры глыбокіх ямаў з драўлянай абкладкай, для гарадскіх могільнікаў характэрны: адсутнасць пахаванняў з усходняй арыентыроўкай; зніжэнне працэнта пахаванняў з рукамі, выцягнутымі ўздоўж тулава, і павялічэнне колькасці пахаванняў з рукамі, складзенымі на жываце; значна меншая колькасць скарыстання агня ў абрадзе, адсут-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

насць пахаванняў на выпаленым мацерыку, якія вельмі распаўсюджаныя на вясковых могільніках; выключная беднасць керамікай[5,29].

Вельмі цікавым з'яўляецца і той факт, што хрысціянізацыя не прывяла да змены ўяўленняў аб адзінстве ўсіх жывых і памерлых членаў родавых калектываў. У XII – XIII захоўваюцца ўяўленні звязаныя з канцэпцыяй пастаяннай сувязі ўсіх жывых і памерлых членаў рода, як паганцаў, гэтак і хрысціян. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў пазнейшых пахаваннях па абраду трупапалажэння на старых паганскіх могільніках, упускных пахаваннях у насып, змяшчэнні на курганных паганскіх насыпах крыжоў, размяшчэнні пазнейшых хрысцінскіх грунтовых могілак побач з курганнымі групамі. Можна меркаваць, што падобныя прыклады сведчаць аб імкненні ўвесці ў новую (хрысціянскую) культавую традыцыю памерлых у паганстве родзічаў. Падобныя звычаі на нашых землях, як нам здаецца, маюць тыпалагічнае падабенства са звычаямі "пасмяротнага хрысціянства", якія былі характэрныя для франкаў і скандынаваў у перыяд хрысціянізацыі іх земляў. Маем на ўвазе франскія пахаванні, калі над паганскімі пахаваннямі заснавальнікаў рода ўзводзілі хрысціянскія капліцы, ў якіх побач з імі хавалі іх хрысціянізаваных нашчадкаў. Падобныя пахаванні далі падставы даследчыкам меркаваць, што пераемнасць паміж памерлымі дахрысціянскімі і хрысціянскімі прадстаўнікамі рода не была парушана хрышчэннем. На фізічным, структурным узроўні, заснавальніку клана магіла ў межах царквы была прадстаўлена ўжо пасля смерці, што ўводзіла яго ў новую, хрысціянскую традыцыю клана. Працэс кантамінацыі дахрысціянскай практыкі шанавання продкаў з хрысціянскім культам памерлых прасочваецца і ў ранніх шведскіх могільніках. У выніку – шанаване продкаў уключалася ў новую рэлігійную практыку. Наварочванне ў хрысціянства, ў такім выпадку, разглядалася як не індывідуальны а калектыўны акт, які распаўсюджваўся цалкам на родавы калектыў ды і на ўсё племя, якое разглядалася як лучнасць усіх жывых і памерлых пакаленняў[6, 193—195]. На карысць думкі аб устойлівым існаванні падобных уяўленняў у усходнеславянскім асяроддзі пасля хрысціянізацыі сведчаць і пісьмовыя крыніцы, і жывая беларуская фальклорная традыцыя. Гэта вельмі красамоўна пацвярджаецца існаваннем звычая "другіх" (пазацаркоўных) памінак па памерших продках звыш кананічнага памінання ў храме. Вельмі паказальны ў сувязі з гэтым і культ княскіх родапачынальнікаў, які ўключаў у сябе наступныя элементы: пазацаркоўную малітву да памерлага родзіча, звычай даваць нованароджанаму князю два імя і адрозны ад хрышчэння абрад "пастрыга". Падвойныя імёны князёў адрозніваюцца летапісам як "княжие" і "крестильные". Паказальна, што менавіта "княжее" імя называецца ў летапісах "дедним"



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэтый звычай напрамую звязаны з уяўленнямі аб непарыўным адзінстве жывых і памерлых родзічаў[9,89—90]. Не менш красамоўна аб гэтым сведчаць і народныя паданні звязаныя з пакланеннем курганам як магілам у якіх пахаваныя першапродкі – волаты, а таксама лічыць (асабліва гэта тычыцца вялікіх кургаоў) іх "святымі" месцамі, што было шырока распаўсюджанай з'явай яшчэ ў пачатку XX ст., а ў асобных мясцовасцях захавалася да нашых дзён[1, 227—228; 2, 8—9; 8, 76—77].

Нельга не пагадзіцца з тымі даследчыкамі, якія менавіта XII ст. лічаць часам, калі асноўная маса вясковага насельніцтва засвойвае важнейшыя палажэнні хрысціянскай рэлігіі, у тым ліку і новай эсхаталогіі. Менавіта XII ст. стала часам інтэнсіўнага будаўніцтва мураваных цэркваў у гарадах, на гэты ж час прыпадае шырокае распаўсюджанне хрысціянскай сімволікі – абразкоў, крыжоў цельнікаў і энкалпіёнаў[3, 9—12]. Аб умацаванні новай веры ў гарадах красамоўна сведчыць і знікненне ў сярэдзіне XII ст. з паўсядзённага ўжытку культавых рэчаў, якія былі звязаны з папярэдняй паганскай традыцыяй – гэта тычыцца найперш, гліняных пустацелых яек-пісаніц[16,82].

Такім чынам:

На працягу XI ст. адбываецца засваенне хрысціянскай дактрыны ў гарадах. У гэты ж час пачынаецца распаўсюджанне новых рэлігійных ідэй ў межах усяго рэгіёну, у тым ліку і ў аддаленых ад гарадскіх цэнтраў вёсках. На першым этапе хрысціянізацыі існаваў рэлігійны сінкрэтызм у звычаях і пахавальнай абраднасці, што быў характэрны ў першую чаргу вясковым жыхарам рэгіёну. Гэта знайшло адлюстраванне ў засваенні звычая інгумацыі і скарыстання хрысціянскіх крыжоў у якасці абярогаў, але пры захаванні ўсіх астатніх элементаў паганскай пахавальнай абраднасці.

XII – першая палова XIII ст. можа лічыцца часам, калі важнейшыя элементы хрысціянскай дактрыны былі засвоены большасцю насельніцтва Паўночна-Усходняй Беларусі. Можна думаць, што гэты працэс быў звязаны з "асяданнем" на зямлю дружынна-баярскага саслоўя. Гэта знайшло адлюстраванне ў узнікненнні ў той час вялікай колькасці невялікіх гарадзішч-замкаў, якія з'яўляліся адміністрацыйнымі цэнтрамі валоліц[14, 161]. Як правіла, яны з'яўляліся і цэнтрамі царкоўных прыходаў. Можна меркаваць, што менавіта гэты працэс інспіраваў больш глыбокую і масавую хрысціянізацыю вясковага насельніцтва і паклаў пачатак фармаванню разгалінаванай сеткі царкоўных прыходаў на тэрыторыі епархій. У XII – XIII захоўваюцца ўяўленні звязаныя з канцэпцыяй пастаяннай сувязі ўсіх жывых і памерлых членаў рода, як паганцаў, гэтак і хрысціян. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў пахаваннях па абраду трупапалажэння на старых паганскіх могільніках, упускных паха-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ваннях у насып, змяшчэнні на курганных паганскіх насыпах крыжоў, размяшчэнні пазнейшых хрысцінскіх грунтовых могілак побач з курганнымі групамі.

Няма аніякіх падставаў разглядаць усходнеславянскае насельніцтва Паўночна-Усходняй Беларусі ў XII – XIII стст. як паганскае. Менавіта гэтым часам можна датаваць паўставанне на гэтых землях светапогляднай сістэмы, якую пераважная большасць даследчыкаў схільна вызначаць дэфініцыяй "народнае хрысціянства". На карысць такога меркавання сведчыць масавая адмова ад пакланенння паганскім стодам, закінутасць большасці паганскіх капішч, "ахрысціяньванне" звычаяў звязанных з пакланеннем сакральным камяням, крыніцам і г. д. Паказальныя ў сувязі з гэтым і сюжэты беларускіх паданняў аб цэрквах якія патанулі, альбо пайшлі пад землю. Не паганскае капішча, а *хрысціянская царква* фігуруе ў гэтых тэкстах. Менавіта з хрысціянскай сакральнай прыналежнасцю звязваецца пакланенне такім пагоркам ў беларускай фальклорнай традыцыі, а не наадварот. Паганскія рэмінiстэнцыі працягваюць жыць у народнай дэманалогіі, магічных практыках, элементах пахавальнага культу. Але гэта не дае аніякіх падставаў адносіць тых людзей да носьбітаў паганства – бо як цалкавітая сістэма светапоглядных уяўленняў у гэты час яно было ўжо разбурана.

## Літаратура


***Алексеев Л.В.*** Полоцкая земля. Очерки истории Северной Белоруссии в IX – XIII вв. – Москва, 1966.

***Алексеев Л.В.*** Археология и краеведение Беларуси. XVI в. – 30-е годы XX в. – Мн.,1996.

***Башков А. А.*** Предметы христианского культа индивидуального пользования конца X – XIV вв. на територии Беларуси (классификация, топография, хронология). Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук. – Минск, 2000.

***Богомольников В. В.*** Причины изменений погребального обряда радимичей // Древности Белоруссии и Литвы. – Мн., 1982. – С.98 – 103.

***Богомольников В. В.*** Курганы радимичей // ГАЗ. – Мн., 1994. – №4 . – С.23—35.

***Гири П.*** Использование археологических источников в истории религии и культуры // Одиссей. Человек в истории. Личность и общество: проблемы самоидентификации. – Москва, 1999.

***Гуревич А. Я.*** Избранные труды. Т.1. Москва – Санкт-Петербург, 1999.

***Дучыц Л. У.*** Да пытання аб вялікіх курганах Беларусі // ГАЗ. – Мн., 2000. – №15. – С.76 – 80.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Комарович В. Л.*** Культ рода и земли в княжеской среде XI – XIII вв. // ТОДРЛ. – Москва, 1960. – Вып. 16. – С.84 – 104.

***Левко О.Н.*** Племенные структуры, погосты и волости Оршанского Поднепровья в конце I – начале II тысячелетия// Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. №1(8). – Магілёў, 2001. – С.16 -- 29.

***Макушнікаў А.*** Могільнік Нісімкавічы I каля Чачэрска (Археалагічны каментарый да летанісных звестак пра пахавальныя абрады радзімічаў) // 3 глыбі вякоў. Наш край. – Мн., 1996. – №1. – С.168 – 184.

***Петрухин В. Я.*** Начало этнокультурной истории Руси IX – XI веков. Смоленск – Москва, 1995.

**Радзивиловская летопись.** Текст. Исследование. Описание миниатюр. Санкт-Петербург – Москва, 1994.

***Риер Я.Г.*** Аграрный мир Восточной и Центральной Европы в средние века по археологическим данным. – Могилев, 2000.

***Седов В. В.*** Восточные славяне в VI – XIII вв. – Москва, 1982.

***Седов В. В.*** Писанки // Славяне и их соседи (Археология, нумизматика, этнология). – Мн., 1998. – С.81—85.

***Седых В. А.*** Большие курганы Древней Руси // ГАЗ. – Мн., 1997. – №11 – С. 28 – 31.

***Семянчук Г.М.*** Новая катэгорыя археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (грунтовыя могільнікі XI – XIII стст.) // ГАЗ. – Мн., 1993. – С.124 – 133.

***Шмидт Е. А.*** Некоторые особенности погребального обряда смоленских кривичей в период перехода от язычества к христианству // Древности славян и Руси. – Москва, 1988. – С. 92 – 97.

***Штыхаў Г.В.*** Крывічы. – Мн., 1992.

***Leciejewicz L.*** Wyznacznik pozycji spolecznej w rytuale pogrzebowym wczesniejszego sredniowiecza // Czlowiek w spoleczenstwie sredniowiecznym. – Warszawa, 1997. – S.45 – 55.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова